

# ВАЕННАЯ БЯСПЕКА І ЭКАНАМІЧНАЯ СТАБІЛЬНАСЦЬ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заслухаў даклады па найважнейшых пытаннях**

(Стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

16 КАСТРЫЧНІКА 2025 г. ЧАЦВЕР № 200 (30588)

# ЦЁПЛАЕ ЖЫЛЛЁ З ПАХАМ ЛЕСУ

## Драўляныя домакамплекты становяцца ўсё больш даступныя




У свой час Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што галоўнае багацце нашых лясоў — драўніна — выкарыстоўваецца ў эканоміцы не так эфектыўна, як хацелася б. Акрамя таго, кіраўніком дзяржавы была пастаўлена задача адрадзіць драўлянае домабудаванне. Мінлясгас падхапіў гэту ініцыятыву. Беларусь — гэта сапраўды лясная краіна, заявіў міністр лясной гаспадаркі краіны Аляксандр Кулік на XXI Міжнароднай спецыялізаванай выстаўцы-кірмашы «Лесдрэўтэх», якая ў сераду стартавала ў Мінскім міжнародным выставачным цэнтры. Акрамя сацыяльнага і экалагічнага кірункаў лясная галіна — гэта сур'ёзны эканамічны патэнцыял для развіцця прамысловасці ўсёй краіны.

СТАР. 12–13

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.



ЧАМУ ДЗІКІЯ ЖЫВЁЛЫ ПЕРАСЯЛЯЮЦЦА Ў ГАРАДЫ 15

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X
25200

# PRO ЭКАНОМІКУ



Сёння з чарговага выпуску нашага праекта вы даведаецеся, чаму штучны інтэлект павінен стымуляваць людзей думаць больш творча і нестандартна, а таксама што змеціцца ў рабоце індывідуальных прадпрымальнікаў на маркетплэйсах. Аб тым, наколькі і куды вырас экспарт беларускіх тавараў, — у інфармацыі ад Мінэканомікі, а спецыялісты ЕЭК раскажуць, чаму Аб'яднаныя Арабскія Эміраты — надзвычай перспектыўны рынак для краін ЕАЭС.

У рубрыцы «Меркаванне» разам з экспертамі паразважаем аб праблемах развіцця сучаснай навукі, яе значэнні ў развіцці грамадства, магчымасцях тэхналагічных прарываў і праблемах захавання канкурэнтаздольнасці краіны.

СТАР. 7–10

# ВАЕННАЯ БЯСПЕКА І ЭКАНАМІЧНАЯ

## Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заслухаў даклады па найважнейшых пытаннях



Прэм'ер-міністр Аляксандр Турчын далажыў аб унутраным парадку дня, узаемадзеянні з галоўнымі партнёрамі Беларусі на знешнеэканамічным трэку. Ключавая тэма даклада Прэм'ер-міністра — работа прамысловага сектара Беларусі ў цэлым.

У прыватнасці, зніжэнне аб'ёмаў вытворчасці (па аб'ектыўных і суб'ектыўных прычынах) і экспарту ў студзені — жніўні гэтага года, пра што сведчаць даныя статыстыкі. Прэзідэнт запатрабаваў ад Прэм'ер-міністра сур'ёзна заняцца галіной, звярнуць увагу на гэты кірунак.

У панядзелак кіраўнік дзяржавы правёў кадравы дзень. Яго вынікі і задачы, якія стаяць перад беларускай лёгкай прамысловасцю і прадпрыемствамі, дзе абнавілася кіраўніцтва, таксама абмяркоўваліся падчас даклада. Асобным пунктам у дакладзе кіраўніка ўрада стала яго сустрэча з міністрам прамысловасці і гандлю Расіі Антонам Аліханавым, якую Аляксандр Турчын правёў у сераду раніцай.

### «НЕКАТОРЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ БУДУЦЬ УЗЯТЫЯ НА РУЧНОЕ КІРАВАННЕ»

**Пра дэталі даклада Аляксандр Турчын расказаў журналістам.**

Адным з галоўных пытанняў, вынесеных на даклад кіраўніку дзяржавы, ён назваў нафтаперапрацоўчую прамысловасць краіны. «Літаральна сёння мы завяршылі, скажам так, паўгадавую няпростую работу з нашымі расійскімі партнёрамі па ўмовах функцыянавання гэтай галіны на сярэднетэрміновую перспектыву. На ўзаемавыгадных умовах, якія дазваляюць нашым нафтаперапрацоўчым заводам эфектыўна працаваць», — праінфармаваў Прэм'ер-міністр. Ён звярнуў увагу, што прынятыя ўрадам меры ў



гэтым перыядзе ўжо далі значны эканамічны эфект для айчынных прадпрыемстваў і ён вылічаецца не адной сотняй мільёнаў долараў.

Аляксандр Турчын удакладніў, што пытанне работы галіны разглядалася ў кантэксце сітуацыі на рынку нафтапрадуктаў у суседніх краінах. «Я далажыў Прэзідэнту, што сітуацыя на ўнутраным рынку з забеспячэннем нафтапрадуктамі ў нас стабільная і ніякіх узрушэнняў проста не можа быць», — сказаў ён.

Што тычыцца сустрэчы з Антонам Аліханавым, то Аляксандр Турчын расказаў, што абмяркоўваліся не толькі бягучы стан супрацоўніцтва ў прамысловай сферы, але і перспектывы. «Адно з пытанняў заключаецца ў тым, што нам часам трэба глядзець не толькі традыцыйныя прадукты, якія мы пастаўляем на рынак Расійскай Федэрацыі, але і на новыя прадукты і тавары, у якіх мае патрэбу рынак Расіі і якія мы можам вырабляць. Напрыклад, лесанарыхтоўчыя машыны, якія вырабляе кампанія «Амкадор». Расійская Федэрацыя зацікаўлена ў іх пастаўках, працэс ідзе, але нам яго трэба фіналізаваць. Ужо літаральна з наступнага года пачынаць інтэнсіўныя пастаўкі гэтых машын на рынак Расійскай Федэрацыі. Абмяркавалі і іншыя пытанні. Ёсць праблемы, але частка з іх была вырашана падчас нашай сённяшняй сустрэчы», — распавёў Аляксандр Турчын.

Важнай тэмай даклада ў Прэзідэнта стала прамысловасць. Кіраўнік урада адзначыў, што вялікую занепакоенасць выклікае стан айчыннага машынабудавання. І на гэта ёсць як аб'ектыўныя, так і суб'ектыўныя прычыны. «Нам вельмі важна выпрацаваць пэўныя механізмы і разуменне, як гэтыя механізмы павінны працаваць для таго, каб сёння забяспечваць эфектыўную работу, прыносіць прыбытак, плаціць людзям дастойную заработную плату і выконваць свае фінансавыя абавязкі. Некаторыя прадпрыемствы мы будзем браць на ручное кіраванне. Хаця б на нейкі перыяд, каб кантраляваць працэсы, якія там адбываюцца. Часам у кіраўнікоў узнікаюць спакусы «простых рашэнняў» — вырабіць



прадукцыю і адправіць яе на склад або адправіць сваім дылерам за мяжу і атрымаць за гэта грошы. Рашэнне геніяльнае па сваёй прастаце, але нясе вялікія наступствы ў выглядзе адсутнасці абаротных сродкаў і пагаршэння фінансавага стану. Эфектыўная работа нашых прадпрыемстваў, збалансаваны рост — гэта вызначальны фактар. Таму прамысловасць пад нашым кантролем», — адзначыў Аляксандр Турчын. Ён дадаў, што ўжо сёлета былі прыняты шэраг рашэнняў, выкананне якіх дазволіла паспяхова функцыянаваць нашым прадпрыемствам ужо ў гэтым годзе.

Што тычыцца «Беллегпрама», то там, па словах кіраўніка ўрада, патрэбна прыняцце сістэмных рашэнняў. Ён звярнуў увагу, што лёгкая прамысловасць у нашай краіне прадстаўлена вялікай колькасцю прадпрыемстваў, большасць з якіх не ўваходзіць у канцэрн. А ў той жа час у самім «Беллегпраме» некаторыя кірункі прадстаўлены адным ці двума прадпрыемствамі. «Ужо не адзін раз і на ўзроўні кіраўніка дзяржавы мы разглядалі работу гэтых прадпрыемстваў. На жаль, так здараецца, што меры дзяржаўнай падтрымкі дазваляюць прадпрыемствам толькі на адносна невялікі перыяд часу стабільна функцыянаваць. А затым даводзіцца зноў прасіць дапамогі. Задача новага кіраўніка канцэрна — выпрацаваць сістэмныя меры (хаця б на сярэднетэрміновую перспектыву), якія неабходныя для стабільнага функцыянавання гэтых прадпрыемстваў», — растлумачыў Аляксандр Турчын. Па яго словах, ад новых кіраўнікоў асобных прадпрыемстваў, прызначаных у панядзелак, чакаюць найперш аналізу сітуацыі на вытворчасцях і прапаноў мер па паляпшэнні сітуацыі на кожным прадпрыемстве.

Кажучы пра дыверсіфікацыю экспарту, якая заўсёды была важным аспектам у нашай эканоміцы, Прэм'ер-міністр падкрэсліў, што ў фокусе ўвагі ўрада застаюцца ўсе перспектыўныя кірункі экспартнай дзейнасці. Найперш нашы бліжэйшыя партнёры, краіны СНД. «Найперш Казахстан і Узбекістан — дзве вялікія эканомікі, нашы даўнія партнёры. Але, на жаль, па цэлым шэрагу кірункаў апошнім часам супрацоўніцтва з гэтымі краінамі было не на тым узроўні, на якім павінна быць, — удакладніў Прэм'ер-міністр. — І неабходна надаць імпульс нашым адносінам. Гэта блізкія нам краіны, мы адзін аднаго цудоўна разумеем, выдатныя адносіны на ўзроўні кіраўніцтва дзяржаў. Таму мы сёння абавязаны вывесці наша эканамічнае супрацоўніцтва на той узровень, які адпавядае нашым палітычным адносінам».



Галоўнай тэмай даклада Дзяржсакратара Савета бяспекі Аляксандра Вальфовіча стала раптоўная праверка Узброеных Сіл Беларусі, якая праводзіцца па рашэнні Прэзідэнта. Гаворка ішла пра асаблівасці другога этапу праверкі і першыя вынікі ў цэлым. Таксама закранулі кірункі, на якія Прэзідэнт і раней патрабаваў звярнуць асаблівую ўвагу: прымяненне беспілотнікаў і сродкаў радыёэлектроннай барацьбы; вопыт спецыяльнай ваеннай аперацыі ва Украіне, які неабходна ўлічваць пры падрыхтоўцы айчынных Узброеных Сіл.

### «ЁСЦЬ УСЁ, КАБ АБАРАНІЦЬ НАШУ КРАІНУ»

**У размове з журналістамі Аляксандр Вальфовіч расказаў, што праверка Узброеных Сіл выйшла на фінішную прамую.**

«Наогул, усё, што датычыцца падрыхтоўкі структурных элементаў ваеннай арганізацыі дзяржавы, Прэзідэнт трымае на асабістым кантролі і пастаянна цікавіцца, дзе рыхтуюцца і чым займаюцца нашы структурныя падраздзяленні, у першую чаргу Узброеных Сіл. Гэтага патрабуе ваенна-палітычнае становішча, якое складваецца вакол Беларусі. «Усё, што датычыцца абароны суверэнітэту, тэрытарыяльнай цэласнасці краіны, яе нацыянальных інтарэсаў, у прыярытэце ў кіраўніка дзяржавы. Таму Узброеным Сілам і іншым структурам ваеннай арганізацыі дзяржавы заўсёды надаецца такая ўвага», — сказаў Аляксандр Вальфовіч.

Па яго словах, усе часці, прыведзеныя ў баявую гатоўнасць, здзейснілі даволі працяглыя маршы і выйшлі на палігоны, якія былі вызначаны ў адпаведнасці з распараджэннем. Сёння на палігонах праходзяць кантрольныя заняткі па прадметах баявой падрыхтоўкі — агнявой, тактычнай, інжынернай. У прыватнасці, 15 кастрычніка танкісты выконваюць стральбу з узбраення танка штатным



# СТАБІЛЬНАСЦЬ

снарадам, а мотастралкі вядуць кантрольную стральбу з БТР-82.

Дзяржсакратар расказаў, што з падраздзяленнямі, якія праходзяць праверку, пастаянна знаходзяцца супрацоўнікі Дзяржаўнага сакратарыята Савета бяспекі, якія адсочваюць ход праверкі. Акрамя прадметаў баявой накіраванасці, правяраецца фізічная падрыхтоўка вайскоўцаў. Аляксандр Вальфовіч назваў гэта важным элементам кантролю. Аснову складаюць сілавыя практыкаванні і практыкаванні на вынослівасць — тое, што трэба на полі бою, зыходзячы з сучаснага вопыту правядзення баявых дзеянняў.

«Асаблівасць праверкі у тым, што яна праводзіцца па завяршэнні ваеннага навучальнага года. Ваеннаслужачыя адпрацавалі ўвесь комплекс мерапрыемстваў, пачынаючы ад адзіночнай падрыхтоўкі да зладжвання падраздзяленняў. Яны дэманструюць тое, чаму іх навучылі падчас заняткаў па баявой падрыхтоўцы ў воінскіх частях і падраздзяленнях. Зыходзячы з гэтай праверкі можна будзе зрабіць высновы аб тым, ці ўсё мы ўлічылі ў праграмах баявой падрыхтоўкі для нашых вайскоўцаў», — падкрэсліў Аляксандр Вальфовіч.

Журналісты ўдакладнілі ў Дзяржсакратара Савета Бяспекі, якім чынам выбіраліся воінскія часці і тэхнікі. Па словах Аляксандра Вальфовіча, у нас усё ёсць, каб надзейна абараняць краіну. Развіваюцца сродкі радыёэлектроннай барацьбы і процідзеяння беспілотнікам. «Гэта таксама вельмі важна. Сродкі радыёэлектроннай барацьбы і ўменне іх прымяняць сёння, напэўна, нават у большым прыярытэце для абароны войск і крытычна важных аб'ектаў інфраструктуры дзяржавы, — дадаў ён. — Наша задача — не колькасць, а якасць ўмець перамагаць свайго ворага. Таму ўпор робіцца на якасць, на тыя сучасныя сродкі ўзброенай барацьбы, якія сёння выпускаюцца нашымі прадпрыемствамі абароннага сектара эканомікі.

Несумненна, вопыт спецыяльнай ваеннай аперацыі і наогул вядзення баявых дзеянняў у іншых канфліктах па свеце ў нашых Узброеных Сілах улічваецца. Гэтыя змены ўнесены ў праграмы баявой падрыхтоўкі. «Калі планавалі нашу праверку, мы як раз улічвалі формы і спосабы вядзення баявых дзеянняў, якія адпрацоўваюцца сёння ў ходзе спецыяльнай ваеннай аперацыі ва Украіне. Падчас праверкі ўвага акцэнтавалася на зладжанасці дзеянняў падраздзяленняў у складзе малых груп, а таксама штурмавых падраздзяленняў. Увага таксама надавалася ўменню ваеннаслужачых абсталяваць раёны ў інжынерным плане з улікам



падраздзяленні для праверкі. « У першым паўгоддзі мы рабілі ўпор на праверку войск Заходняга аператыўнага камандавання. У другім паўгоддзі перанакіравалі нашы намаганні на праверку войск Паўночна-Заходняга аператыўнага камандавання, гэта значыць прыярытэты падзяляюцца, — растлумачыў Дзяржсакратар. — Акрамя гэтага, правяраюцца нашы сродкі Ваенна-паветраных сіл і супрацьпаветранай абароны. Мы плануем палёты кантрольных цэляў і глядзім, як іх выявілі і адрэагавалі нашы Ваенна-паветраныя сілы, войскі супрацьпаветранай абароны».

Журналісты пацікавіліся, наколькі Узброеныя Сілы Беларусі адпавядаюць усім патрабаванням часу. Дзяржсакратар запэўніў, што на ўзбраенні беларускай арміі маюцца самыя сучасныя ўзоры. Пры гэтым упор робіцца не на павелічэнне колькасці ваеннай тэхнікі або колькасці Узброеных Сіл, як гэта адбываецца ў заходніх суседзяў Беларусі. Тым не менш армія рэгулярна забяспечваецца найноўшымі ўзорамі ўзбраення і ваеннай вопыту спецыяльнай ваеннай аперацыі. «Гэта прынцып такі: «закапаўся» чым глыбей, замаскіраваўся — значыць, больш шанцаў на выжыванне і выкананне задач», — растлумачыў Аляксандр Вальфовіч.

Правяралася таксама ўменне процідзейнічаць беспілотным лятальным апаратам і ўжываць сродкі радыёэлектроннай барацьбы. «Вядома ж, гэта ўлічваецца. Трэба вучыць вайскоўцаў таму, што трэба, каб выжыць на полі бою і выканаць пастаўленыя задачы», — дадаў Аляксандр Вальфовіч. Дзяржсакратар Савета Бяспекі адзначыў, што гэтаму спрыяла і праведзенае нядаўна вучэнне «Захад-2025». «Нашы расійскія калегі падчас гэтых вучэнняў падзяліліся з намі тым практычным вопытам (не на словах, а на справе), які яны атрымліваюць у ходзе спецыяльнай ваеннай аперацыі. Сёння гэта ўлічваецца ў нашых Узброеных Сілах пры падрыхтоўцы нашых вайскоўцаў», — падсумаваў ён.

**Валерыя СЦЯЦКО.**



ПА СУТНАСЦІ

# У ІНТАРЭСАХ РАДЗІМЫ

**Які б чалавек ні быў моцны — патрэбны трэніроўкі, які б чалавек ні быў разумны — нельга забывацца пра навуку. Так і з дзяржавамі — ніколі нельга спыняцца. Таму кіраўніцтва Беларусі бесперапынна знаходзіцца ў пошуку дзяржаў-партнёраў, адчыняе новыя дзверы нават на самых звыклых пляцоўках — у авангардзе. Прэзідэнт вызначае трэнды і падтрымлівае тэмп: за мінулы тыдзень Першы наблізіў да Беларусі краіну «дальняй дугі», а на саміце СНД агучыў гістарычную прапанову па збліжэнні краін Садружнасці.**



У снежні мінулага года ў Палацы Аль-Алам (у перакладзе з арабскай — палац сцяга) быў вывешаны беларускі сцяг. А тыдзень таму ў Палацы Незалежнасці — дзяржаўныя сцягі Амана. Гэта прыбярэжная дзяржава, няглядзячы на адлегласць, блізкая нам. У Амане, як і ў Беларусі, актыўна займаюцца дыверсіфікацыяй сваёй эканомікі.

Яшчэ і года не мінула, як мы нанова адкрылі гэту арабскую казку. Хоць у Маскаце Аляксандра Лукашэнку добра ведаюць як смелага лідара з выразнай пазіцыяй на міжнародных трыбунах і як Прэзідэнта краіны, якая валодае мноствам неабходных для Амана кампетэнцый. На Усходзе спачатку прыглядаюцца, а потым ужо вырашаюць дзейнічаць.

Мы тактычна ўмацоўваем свае пазіцыі на Блізкім Усходзе. Яшчэ адзін момант — стратэгічны. Краіны Персідскага заліва, Паўночнай Афрыкі з багатых на радовішчы сыравінных дзяржаў пераходзяць у лігу краін з прамысловым укладам эканомікі. І тут Беларусь становіцца экспарцёрам тэхналогій, а Аман — выхадам у Персідскі заліў і варотамі ў Паўночную Афрыку, хабам для беларускай прадукцыі, кампетэнцый і паслуг.

Ці не самай блізкай (ва ўсіх сэнсах) для нас з'яўляецца пляцоўка СНД. Беларускі лідар заўжды ў авангардзе кіраўніцкіх рашэнняў. У прынцыпе, многае з таго, што прапаноўваў Аляксандр Лукашэнка, цяпер мэйнстрым у Садружнасці. Нават па выніковых дакументах гэтага саміту можна меркаваць. У Душанбэ сярод іншых дакументаў прынята Дэкларацыя энергетычнай бяспекі — даўняя прапанова нашага Прэзідэнта.

Момант стварэння СНД быў спалучаны з сусветнай сенсацыяй, з геапалітычным разломам: крахам СССР, развалам Усходняга блока, маналітнага пункта апоры ўсёй архітэктуры светаўладкавання. Усё, што паклалі на паперу Сталін, Рузвельт і Чэрчыль, — асновы ААН — перакрэслілі Шушкевіч, Ельцын і Краўчук, а амерыканцы засыпалі попелам бамбардзіровак ў Бялградзе і Багдадзе.

Цяперашні постковідны свет на многае расплюшчыў вочы. У тым ліку наконт таго, хто чаго варты. СНД цяпер будзе з плюсам. Гістарычны момант — Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва стала назіральнікам пры СНД. Рэальнасцю становіцца інтэграцыя Садружнасці і ЕАЭС — сур'ёзных удзельнікаў стварэння справядлівага шматпалярнага светаўладкавання. Гэта заўсёды падкрэсліваў Першы. Сапраўды, мы часам нават не ўсведамляем веліч і важнасць сваёй роднай краіны, якая дзякуючы найперш свайму кіраўніку займае значнае месца ў інтэграцыйных аб'яднаннях новага часу, які дыктуе ўмовы шматпалярнасці.

Цяпер час іншых стасункаў. Чарговыя палітычныя лайфхакі ад Лукашэнкі: чатыры крокі на шляху ўмацавання Садружнасці; бяспека, эканоміка, міжнароднае пазіцыянаванне, але пры гэтым захаванне культурнай разнастайнасці. Кіраўнік дзяржавы стаў сапраўдным «хэдлайнерам» саміту ў Душанбэ.

Спалучэнне і ўзаемаабагачэнне ЕАЭС і СНД дазволіць стаць кансалідаваным прасторай для лагістычных калідораў Поўнач — Поўдзень, Захад — Усход, бо размяшчэнне нашых краін вельмі выгаднае. Ці не таму іх спрабуюць расцягваць па розных саюзах і нават знешнепалітычных курсах. Але ў выніку пошук лепшай долі ў чужой сэнсавай прасторы, як вядома, прыводзіць да ментальнай і фізічнай катастрофы — у чарговы раз згадайце Украіну.

Пра пільную ўвагу да СНД сведчыць і прыцэльная крытыка. Сусветным ігракам не патрэбны яшчэ адзін пункт апоры (чытай: сілы). Другі момант — постсавецкая прастора — прывабны рынак збыту, працоўнай сілы і крыніца сыравіны. У нетрах — сусветныя запасы металаў і вуглевадародаў.

Чакаць мірных пацісказ рукі ад тых, каму раней прапаноўвалі інтэграцыю інтэграцый, не варта. Час браць ініцыятыву ў свае рукі і ў забеспячэнні еўразійскай архітэктуры бяспекі. Аднайменны мінскі форум хутка збярэцца ўжо трэці раз.

Запыты сучаснасці — гэта пошукі новых форм знешнепалітычных зносін. Дыктатура калектыўнага Захаду разбураецца на нашых вачах. Але ёсць небяспека, каб на гэтых абломках не вырас новы квазіглабальны цэнтр, у цісках якога апынецца сусветная эканоміка і нацыянальныя эканомікі мноства дзяржаў. Таму неабходна развіваць рэгіянальныя інтэграцыі з глабальным уплывам. Прэзідэнт агучыў новае прачытанне ўжо звыклай Садружнасці — прапанову адзінай эканамічнай прасторы. Пакуль не позна, варта аб'ядноўвацца ў мірны час, каб гэта не спатрэбілася рабіць падчас вайны.

Па тым, як сустрэлі словы нашага лідара палітычныя апаненты на Захадзе, зразумела: смелая і ёмістая заява Першага трапіла прама ў цэль. Толькі з адной рэмаркай: мы вяртаемся не да СССР, а да моцнага свету ў сэрцы Еўразіі. Вядома ж, у інтарэсах роднай Беларусі.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

zepter bank

**Закрытое акционерное общество**
**«Цептер Банк»**

Адрес: 220034, г. Минск, ул. Платонова, 1Б,
эл. адрес: info@zepterbank.by
Тел. 331 89 49, факс 331 89 48

Данная финансовая отчетность размещена на сайте
**www.zepterbank.by**

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
## 30 сентября 2025 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 30.09.2025 | 01.01.2025 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| **1** | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 17 164 | 18 495 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 19 392 | 14 506 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 59 912 | 79 788 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 9 150 | 10 542 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 35 355 | 35 611 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 18 426 | 17 964 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | - | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 3 081 | 3 089 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 6 291 | 7 327 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 168 771 | 187 322 |
| **16** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 2 105 | 11 309 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 103 545 | 116 656 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | - | 62 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 932 | 1 089 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 106 582 | 129 116 |
| **25** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 19 886 | 19 886 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 7 248 | 6 409 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса и резервы | 1214 | 14 350 | 14 378 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 20 705 | 17 533 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 62 189 | 58 206 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 168 771 | 187 322 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
## за 3 квартал 2025 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 30.09.2025 | 30.09.2024 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 5 147 | 4 652 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 1 014 | 562 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 4 133 | 4 090 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 6 558 | 5 686 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 2 125 | 2 770 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 4 433 | 2 916 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | - | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 6 440 | 7 019 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | (155) | 3 849 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 1 293 | 2 691 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 10 694 | 12 228 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 413 | 392 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 5 347 | 247 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 1 364 | 102 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 3 983 | 145 |

Председатель Правления А.В. Игнатов

Главный бухгалтер О.В. Михалевич

Дата подписания: 01 октября 2025 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности,
выданная Национальным банком Республики Беларусь № 31 от 08 февраля 2024 г.
УНП 807000214

САЮЗНАЯ ДЗЯРЖАВА

# «ЁСЦЬ ЗНАЧНЫЯ ПОСПЕХІ»

## Беларусь і Расія намецілі новыя планы па прамысловай кааперацыі

У сераду ў Доме ўрада адбылася сустрэча Прэм'ер-міністра Беларусі Аляксандра ТУРЧЫНА з міністрам прамысловасці і гандлю Расійскай Федэрацыі Антонам АЛІХАНАВЫМ. На ёй бакі абмяркоўвалі пытанні прамысловай кааперацыі, а таксама далейшае развіццё двухбаковага супрацоўніцтва.



Падчас сустрэчы ў вузкім фармаце кіраўнік Урада Рэспублікі Беларусь і міністр прамысловасці і гандлю Расіі абмеркавалі канцэптуальныя падыходы да далейшага ўзаемадзеяння.

**«Апошнім часам супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі калі не ідэальнае, то вельмі блізкае да гэтага стану. Адносіны, якія склаліся паміж урадамі Беларусі і Расіі, маюць вельмі высокі ўзровень. Гэта па-сапраўднаму даверныя адносіны, — адзначыў Прэм'ер-міністр Беларусі Аляксандр Турчын. — Многія пытанні ўдалося за апошні час вырашыць. Сёння мы з калегамі абмяркуем стан нашага супрацоўніцтва ў прамысловай сферы. Ёсць значныя поспехі, ёсць і праблемы, але яны цалкам вырашальныя».**

У сваю чаргу міністр прамысловасці і гандлю Расійскай Федэрацыі Антон Аліханаў адзначыў высокі ўзровень узаемадзеяння з Беларуссю. Паводле яго слоў, сёння ўжо будуюцца новыя планы па прамысловай кааперацыі. «Лічу, што наперадзе ў нас шмат сумесных праектаў — не толькі па развіцці дзеючых прадпрыемстваў, але і па стварэнні абсалютна новых кааперацыйных праектаў. Упэўнены, што нас чакае поспех», — перакананы ён.

Падчас сустрэчы разглядаліся і пытанні супрацоўніцтва ў мікраэлектроніцы, лёгкай прамысловасці, аўтамабілебудаванні. «Мы хацелі б, каб расійская аўтаэлектроніка была больш запатрабаваная ў тым ліку на магутнасцях прадпрыемства «БЕЛДЖЫ». Дарэчы, гэты завод — адзін з найбуйнейшых гульцоў на расійскім рынку», — канкрэтызаваў Антон Аліханаў.

Асобная тэма датычылася праекта «Амкадор-Анега». «Для нас вельмі важная якасная тэхніка па лесанарыхтоўцы. Вялікія поспехі ў сельгасмашынабудаванні — ёсць сумесныя кааперацыйныя праекты, — а таксама ў ліфтабудаванні», — падкрэсліў міністр прамысловасці і гандлю Расіі.

Абмяркоўваюцца сумесныя праекты і ў трэціх краінах, уключаючы Узбекістан і краіны Афрыкі. «Мы дамовіліся з Андрэем Яўгенавічам Кузняцовым (міністрам прамысловасці Беларусі. — **«Зв.»**) правесці сёлета пры вашай падтрымцы сумесную калегію ў Маскве, якую заплануем на снежань. Прадметна, не толькі на ўзроўні міністраў і намеснікаў міністраў, але і на ўзроўні кіраўнікоў дэпартаментаў, упраўленняў, выбудуем шчыльныя камунікацыі для таго, каб мы маглі на экспертным узроўні знаходзіць рашэнні і далей, калі будзе патрабавацца, выносіць іх на абмеркаванне больш высокага кіраўніцтва», — сказаў Антон Аліханаў, дадаўшы, што ў калегіі возьме ўдзел і «Беллегпрам».

Ён нагадаў, што зусім нядаўна ў беларускай сталіцы прайшлі маштабныя мерапрыемствы, уключаючы пасяджэнні Еўразійскага міжурадавага савета і Савета кіраўнікоў урадаў СНД. «На іх былі прадметна разгледжаны розныя аспекты ўзаемадзеяння, у тым ліку і ў прамысловасці, гандлі», — акцэнтаваў міністр прамысловасці і гандлю Расіі. Ён павіншаваў беларускі бок з паспяховым правядзеннем Міжнароднай выстаўкі «ІНАПРАМ. Беларусь». Антон Аліханаў выказаў асаблівую ўдзячнасць беларускім калегам і сябрам — у першую чаргу Міністэрству прамысловасці і Беларускай гандлёва-прамысловай палаце — за ўсебаковае ўзаемадзеянне ў арганізацыі гэтага мерапрыемства. «Яно атрымалася маштабным: за тры дні выстаўку наведала больш за 14 тысяч чалавек. Больш за 500 кампаній з розных краін свету прадэманстравалі сваю прадукцыю», — рэзюмаваў ён.

Пасля сустрэчы ў Доме ўрада расійская дэлегацыя наведала шэраг беларускіх прадпрыемстваў, улючаючы ААТ «Інтэграл» — кіруючая кампанія холдынгу «Інтэграл» і ААТ «Пеленг».

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота БелТА.**



# АСНОВА МОЦНАЙ ДЗЯРЖАВЫ

## У Полацку на сямейным форуме гаварылі аб самых важных каштоўнасцях

Форум «Размова аб важным: шчаслівая сям'я — моцная дзяржава», падчас якога абмеркавалі ролю сям'і ва ўмацаванні дзяржавы і ролю дзяржавы ў падтрымцы сям'і, у трэці раз прайшоў у старажытным Полацку. Па пяць маладых і шматдзетных сем'яў з усіх абласцей і Мінска, парламентарыі, прадстаўнікі Беларускай праваслаўнай царквы, грамадскіх арганізацый, кіраўнікі органаў дзяржкіравання ўключыліся ў дыялог аб дасягненнях і вектарах работы ў адносінах сям'і, дзяцей, маці.




Сучасныя рэаліі імкліва мяняюцца, і тое, што здавалася праблемай яшчэ ўчора, сёння больш не актуальна. Але час падкідвае новыя выклікі. Напрыклад, на форуме агучвалі прычыны такіх прыкрых з'яў, як ледзьве не татальнае брыдкаслоўе, булінг дзяцей, перавод рамантычных адносін паміж мужчынам і жанчынай у плоскасць пошуку выгод, нежаданне маладых сужэнцаў «абцяжарваць» сябе нараджэннем дзяцей.

Аднак большасць устояў, традыцыйных для беларускага народа, застаюцца непарушнымі. Інстытуты дзяржавы прапаноўваюць новыя спосабы ўдзелу сем'яў у грамадскім жыцці, выказвання грамадзянскай пазіцыі. Умацоўваецца сіла ўплыву царквы на фарміраванне духоўных і сямейных каштоўнасцяў. Чырвонай ніткай праз выступленні ўсіх спікераў праходзіла думка аб тым, што зберагчы і матэрыяльную, і нематэрыяльную спадчыну нашых продкаў мы зможам толькі разам: у кожнай сям'і паасобку і ў той сям'і, якой мы лічым усю Беларусь з яе вёскамі і гарадамі, рэгіёнамі і сталіцай.

Такі прынцып сфармуляваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка: «Мы «Сем «Я» — шэсць абласцей і сталіца», нагадала ў сваім выступленні **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА.** «У здаровай сямейнай атмасферы выхоўваюцца дзеці, для якіх любоў і павага да бацькоў, вернасць Радзіме — непарушныя жыццёвыя арыенціры, — адзначыла спікер. — Сям'я — гэта першы і самы важны інстытут сацыялізацыі. Тут закладваюцца асновы маралі, фарміруецца гістарычная памяць, нацыянальная ідэнтычнасць». Наталля Качанава нагадала, што аспекты сямейнай палітыкі замацаваны ў законах, указах Прэзідэнта, дзяржаўных праграмах, прапісаны ў Канстытуцыі і Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі. Пытанні шлюбу і сям'і, абароны мацярынства і дзяцінства застаюцца ў ліку прыярытэтных кірункаў заканатворчай дзейнасці і парламентарыяў.

Савет Рэспублікі з'яўляецца арганізатарам сямейнага форуму разам з Беларускай праваслаўнай царквой. Да вялікай размовы далучыўся Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, іншыя прадстаўнікі духавенства.

Цікавыя параўнанні зрабіў падчас свайго выступлення **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, генеральны дырэктар цэнтра культуры «Віцебск», бацька двух сыноў Глеб ЛАПІЦКІ.** Як чалавек творчы, ён правёў аналогію паміж сям'ёй і аркестрам. У вялікім музычным калектыве важны кожны інструмент. Паасобку яны не ўспрымаюцца і толькі разам даюць паўнацэннае ўнікальнае гучанне.

«У кожнай сям'і свая палітра каштоўнасцяў, — падзяліўся назіраннямі Глеб Лапіцкі. — Нават стаўшы дарослым, чалавек карыстаецца той сістэмай каштоўнасцяў, якая закладзена ў дзяцінстве. Дзіця нясе ў соцыум плён сям'і. Але нельга адмаўляць і ўплыў грамадства на сям'ю. Найлепшы сродак выхавання — уласны прыклад. Паўтараючы за бацькамі, сваімі лідарамі, пэўныя дзеянні, дзеці вучацца разумець каштоўнасць іх працы, а таксама прыносіць карысць тым, хто побач. Так сямейны аркестр пачынае гучаць зладжанай сімфоніяй на ўсё асяроддзе.



Вопытам сваёй сям'і падзяліўся **намеснік начальніка аддзела ўпраўлення аховы Дзяржаўнай граніцы Мазырскага пагранатрада, падпалкоўнік, бацька траіх дзяцей Дзяніс ВЕРАКСА.** Ён згадаў, як хлопчыкам пачуў ад свайго прадзеда, ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, кавалера ордэнаў Славы III і II ступеняў Якава Капоры словы, якія сталі жыццёвым дэвізам Вераксаў-малодшых: «Моцны той род, які сваіх продкаў памятае і беражэ, памятае гісторыю сваёй дзяржавы». Таму разам з жонкай Юліяй Дзяніс падштурхоўвае дзяцей быць дзейснымі захавальнікамі гісторыі сваёй сям'і. Па-першае, яны рэканструявалі пабудаваную прадзедам пасля вайны хату, пераехалі жыць у яе. Вёскі не баяцца, нездарма сталі пераможцамі рэспубліканскага праекта «Уладар сяла — 2022».



Сям'ёю наведвалі архівы, шукалі дакументы і фотаздымкі — і аднавілі свой радавод. Старэйшыя хлопцы сталі аўтарамі кнігі «Мы з дынастыі ваенных. Наша будучая прафесія — Радзіму абараняць». Вераксы выступілі з ініцыятывай «Паклон табе, бацькоўскі край», яна рэалізавана, і цяпер на ўездзе ў навакольныя вёскі ўстаноўлены таблічкі з QR-кодамі, перайшоўшы па якіх можна даведацца пра гісторыю і выдатных асоб гэтых населеных пунктаў. А яшчэ яны пераможцы конкурсу Саюзнай дзяржавы «Маладая сям'я — 2024», а Юлія летась стала фіналісткай конкурсу прыгажосці сярод шматдзетных маці «Краса Беларусі».

— Дзяржава дае магчымасці сем'ям жыць цікава і насычана, рэалізоўвацца ў розных кірунках, — даводзіў Дзяніс Веракса. — Толькі не ляніўцеся, рухайцеся самі — гэта дасць падставы для гонару, будзе што пакінуць пасля сябе.

Удзельнікі мерапрыемства апладысментамі падтрымалі прапанову Наталлі Качанавай правесці форум «Размова аб важным: шчаслівая сям'я — моцная дзяржава» на міжнародным узроўні. «Мы запросім нашых калег з іншых краін, якія падзяляюць з намі духоўна-маральныя і традыцыйныя каштоўнасці нашых сем'яў», — паабяцала Старшыня Савета Рэспублікі.

**Святлана ЯКАЎЛЕВА,**
*г. Полацк.*
**Фота БелТА.**




**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)**

**ИНФОРМИРУЕТ**
**о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Гродненскому областному потребительскому обществу (Гродненский филиал)**

**Аукцион состоится 06.11.2025 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 400/С-159346 (назначение – здание многофункциональное, наименование – здание административно-торгового и общественного питания), площадью 1 564,50 кв. м, г. Гродно, ш. Озерское, 43 и пожарная сигнализация ГР0000253.<br>Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 440100000001008366, площадью 0,1170 га (назначение – земельный участок для строительства и обслуживания здания многофункционального), расположенном по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 43.<br>Условия проведения аукциона:<br>- оплату приобретаемого объекта производить путем перечисления денежных средств на расчетный счет Продавца, а также иными способами, не противоречащими действующему законодательству Республики Беларусь;<br>- расходы по государственной регистрации договора купли-продажи, перехода права собственности возложить на Покупателя;<br>- право собственности переходит к Покупателю после полной оплаты, передачи объекта и государственной регистрации данного права в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;<br>- документом, подтверждающим передачу имущества, является акт приема-передачи |
| **Начальная цена продажи** | 342 423,17 руб. (триста сорок две тысячи четыреста двадцать три рубля семнадцать копеек) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 34 242 руб. (тридцать четыре тысячи двести сорок два рубля) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. Последний день приема заявлений – **04.11.2025 г. до 15.00** |

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 12.07.2024 г.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony



Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига 40, пом. 46, офис 2 |
| **Продавец** | Унитарное предприятие «Брествторчермет», 224014, г. Брест, ул. Бауманская, 40 |
| **Оператор/ Адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, офис 1. **www.ipmtorgi.by** |

| **Предмет электронных торгов** | **Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб.** |
|---|---|
| **Газификатор холодный криогенный 1500/17-20**, инв. № 130059, по адресу: г. Ивацевичи, ул. Гойшика, 1 | **40 800,00** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 10 (десять)** рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и установленное вознаграждение **6 %** от цены продажи лотов в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 17.11.2025 г. с 11.00 до 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **14.11.2025 г. до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35, E-mail: auction@cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Белгазпромбанк», 220121, г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2 |
| **Предмет электронных торгов** | |
| **Лот № 1** | |
| **Площадка для складирования пиломатериалов и упаковки** (Сооружение специализированное лесохозяйственного назначения), инв. № 330/С-21789, общ. пл. 2 280,0 кв. м. ***Адрес: Гомельская обл., г. Мозырь, ул. Социалистическая*. Сведения о земельном участке:** общ. пл. 0,3497 га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для складирования пиломатериалов и упаковки | |
| Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 20 000,00 бел. руб. | |
| **Лот № 2** | |
| **Литер А 3/К Здание административно-хозяйственное** (Здание административно-хозяйственное), инв. № 500/С-18786, общ. пл. 2641,4 кв. м. ***Адрес: г. Минск, ул. Жилуновича, 11.*** Обременение: договоры аренды. **Сведения о земельном участке:** общ. пл. 0,5044 га, предоставлен продавцу на праве общего долевого постоянного пользования (доля в праве 63/100) для эксплуатации и обслуживания здания административно-хозяйственного и специализированных складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | |
| Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 4 950 000,00 бел. руб. | |
| **Лот № 3** | |
| **Административное помещение № 508** (Административное помещение), инв. № 500/D-70613192, общ. пл. 93,2 кв. м. ***Адрес: г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 2, пом. 508*** | |
| Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 220 000,00 бел. руб. | |
| **Лот № 4** | |
| **Часть первого этажа административного здания бывшего заводоуправления** (Административное помещение), инв. № 700/D-14889, общ. пл. 349,0 кв. м. **Часть второго этажа административного здания бывшего заводоуправления** (Административное помещение), инв. № 700/D-14891, общ. пл. 342,1 кв. м. **Часть третьего этажа административного здания бывшего заводоуправления** (Административное помещение), инв. № 700/D-15247, общ. пл. 348,5 кв. м. ***Адрес: Могилевская обл., г. Могилев, пр-т Витебский, 4*** | |
| Начальная цена лота № 4 с НДС 20 % – 690 000,00 бел. руб. | |
| Шаг электронных торгов – 5 % от текущей цены по каждому лоту | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов № 1 и **5 %** от начальной цены предмета электронных торгов №№ 2-4 перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638 | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи. Оплата услуг по государственной регистрации договора купли-продажи, а также основанных на них прав в органах по государственной регистрации и земельному кадастру осуществляется за счет Продавца | |
| **Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **6 %** от цены продажи лота № 1, **4 %** от цены продажи лотов № 3, **3 %** от цены продажи лота № 4, **2 %** от цены продажи лота № 2 в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов | |
| Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: 17.11.2025 г. с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| **Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **14.11.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by | |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор аукциона)
по поручению **КУП «Слуцкое ЖКХ»** (продавец)
проводит открытый аукцион по продаже

ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ
**с инв. № 640/D-83529**
(наименование – **консервно-фабрикатный цех)**

**общей площадью 2 824,2 кв. м,
расположенного по адресу:
Минская область, г. Слуцк, ул. Ленина, 116-2.**

**Сведения о земельном участке:
кадастровый номер – 624650100001009306, пл. – 1,1739 га
*(право постоянного пользования)*.**
Начальная цена без НДС – **42,00** бел. руб. (одна базовая величина).
**Начальная цена снижена до 1 базовой величины.
Задаток – 42,00 бел. руб.**

**Информация о торгах опубликована на сайтах:
minsk-region.gov.by, rlt.by, au.nca.by.**
*Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 18.10.2022, 30.12.2022, 07.03.2023, 19.05.2023, 01.08.2023, 03.11.2023, 17.02.2024, 24.05.2024, 14.08.2024, 24.10.2024, 05.02.2025, 21.03.2025, 09.08.2025.*

Аукцион состоится **03.11.2025** в **12.00**
по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **30.10.2025** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 136-31-11.
Тел. для осмотра: (8044) 585-09-38.**

УНП 600154264


ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# УНУТРАНЫЯ ПЫТАННІ І ЗНЕШНІЯ ПРЫЯРЫТЭТЫ

## Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў разгледзелі шэраг законапраектаў

Сярод іх — дакументы экалагічнай скіраванасці, звязаныя з аховай і рацыянальным выкарыстаннем прыродных рэсурсаў Беларусі. Змяненні закрануць заканадаўства аб аўтамабільных дарогах і дарожнай дзейнасці. Павышаецца даступнасць натарыяльнага абслугоўвання для грамадзян і юрыдычных асоб. Законапраекты міжнароднага характару, звязаныя з паслабленнем візавага рэжыму або ўвогуле яго адменай для шэрагу краін, накіраваны на ўзмацненне кантактаў Беларусі з міжнароднымі партнёрамі.



### З КЛОПАТАМ АБ ВАДЗЕ І НЕТРАХ

Праектам Закона «Аб змяненні Воднага кодэкса Рэспублікі Беларусь», прынятым у першым чытанні, Прэзідэнту даюцца паўнамоцтвы па прыняцці рашэнняў аб выкарыстанні паверхневых водных аб'ектаў на бязвыплатнай аснове. Урадам будзе вызначацца парадак выкарыстання паверхневых водных аб'ектаў для плавання на збудаваннях, якія не адносяцца да маламерных суднаў (плывучыя дамы, лазні, іншыя падобныя збудаванні).

«Для юрыдычных асоб будзе дадзена права браць у арэнду паверхневы водны аб'ект для таго, каб арганізоўваць адпачынак, развіваць фізічную культуру, спорт і турызм, — звярнуў увагу **член Пастаяннай камісіі па экалогіі і прыродакарыстанні Палаты прадстаўнікоў Уладзімір БАБІЧАЎ**. — Пры гэтым за імі замацоўваецца адказнасць па ўтрыманні і добраўпарадкаванні дадзенага воднага аб'екта. Для фізічных асоб уводзіцца забарона на ўзвядзенне больш як адной сажалкі-копанкі і іншых паверхневых водных аб'ектаў у межах прадастаўленага зямельнага ўчастка».



Законапраектам «Аб змяненні законаў па пытаннях нетракарыстання», адобраным у першым чытанні, дадатковыя абавязкі ўскладаюцца на мясцовыя органы ўлады. «Яны могуць прымаць рашэнне аб выбары зямельнага ўчастка для размяшчэння ўнутрыгаспадарчых кар'ераў, узгадняць план рэкультывацыі земляў, якія былі парушаны ў выніку горных работ пры здабычы карысных выкапняў, спыняць ва ўстаноўленым парадку або кансерваваць горныя прадпрыемствы і горныя выпрацоўкі», — канкрэтызаваў **член Пастаяннай камісіі па экалогіі і прыродакарыстанні Палаты прадстаўнікоў Дзяніс УШАЦКІ**.

Як праінфармаваў **міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Сяргей МАСЛЯК**, новаўвядзенні дазволяць сельгаспрадпрыемствам здабываць карысныя выкапні ў выглядзе пяску і гравію, выкарыстоўваць іх для ўласных патрэб, што значна павысіць эканоміку і рэнтабельнасць. «Акрамя таго, гэта дазволіць ім рэалізоўваць прадукцыю мясцоваму насельніцтву па цэнах, не вышэйшых за рыначныя», — удакладніў ён.

### ПАРАДАК НА ДАРОГАХ І Ў НАТАРЫЯЦЕ

Законапраектам «Аб змяненні законаў», разгледжаным у першым чытанні, уносяцца змяненні ў Закон «Аб аўтамабільных дарогах і дарожнай дзейнасці» і Кодэкс аб архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці. У прыватнасці, Міністэрства транспарту і камунікацый будзе весці інфармацыйны фонд у галіне дарожнай дзейнасці, які ўяўляе сабой сукупнасць сістэматызаваных звестак і дакументаў, што выкарыстоўваюцца пры ажыццяўленні дарожнай дзейнасці. Устанаўліваюцца асаблівасці распрацоўкі праектнай дакументацыі, узвядзення, рэканструкцыі, эксплуатацыі і капітальнага рамонту аўтамабільных дарог.

Законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях натарыяльнай дзейнасці», прыняты ў першым чытанні, прадугледжвае скасаванне натарыяльных бюро і ўстанаўленне адзінай арганізацыйнай формы ажыццяўлення натарыяльнай дзейнасці — натарыяльная кантора. Натарыусам, якія ў цяперашні час ажыццяўляюць натарыяльную дзейнасць у натарыяльным бюро, даецца магчымасць перайсці ў натарыяльныя канторы без здачы кваліфікацыйнага іспыту і анулявання пасведчання на ажыццяўленне натарыяльнай дзейнасці.

Як звярнуў увагу **міністр юстыцыі Яўген КАВАЛЕНКА**, у работу натарыусаў больш актыўна ўкараняюцца лічбавыя тэхналогіі. «У прыватнасці, з'яўляюцца такія новыя віды натарыяльных дзеянняў, як пасведчанне электронных даверанасцяў, згоды, — канкрэтызаваў ён. — Мы рыхтуем аснову для таго, каб грамадзяне, не выходзячы з дому, маглі фарміраваць пакет электронных дакументаў, якія нічым не будуць адрознівацца ад папяровых, і ў далейшым звяртацца па здзяйсненне адміністрацыйных працэдур. У перспектыве будзе магчымы такі фармат работы, калі згода або даверанасць пасля адпаведных дзеянняў натарыуса накіроўваецца адразу ў той орган, арганізацыю, дзе патрэбен гэты дакумент».

### КУРС — НА ЎЗМАЦНЕННЕ МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН

Дэпутаты ратыфікавалі пагадненні паміж урадам Беларусі і ўрадамі Уганды, Зімбабвэ, Гвінеі-Бісау, Калумбіі, Лаоса і Турцыі, якія ў тым ці іншым аспекце датычацца адмены віз.

«Гэта надасць магутны імпульс двухбаковаму супрацоўніцтву, — патлумачыў **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Алег ДЗЯЧЭНКА**. — Адмена віз для ўладальнікаў дыпламатычных і службовых пашпартоў дазволіць узмацніць кантакты паміж нашымі дзяржавамі. Тым больш сёння і афрыканскі, і паўднёва-амерыканскі вектар нашай знешняй палітыкі з'яўляюцца аднымі з прыярытэтных.

**Беларусі ёсць што прапанаваць нашым афрыканскім сябрам і партнёрам і ў сферы машынабудавання, і сельскай гаспадаркі, і забеспячэння харчовай бяспекі, гуманітарнага супрацоўніцтва. У прыватнасці, гэта датычыцца навучання афрыканскіх студэнтаў у нашых цудоўных універсітэтах па запатрабаваных на афрыканскім кантыненце спецыяльнасцях».**

Па словах дэпутата, адпаведны імпульс прынятыя ратыфікацыі нададуць і турыстычнай сферы: беларускія грамадзяне змогуць скарыстацца бязвізавым рэжымам, каб наведваць гэтыя афрыканскія дзяржавы. «Адмена віз для ўладальнікаў службовых пашпартоў датычыцца кіраўнікоў буйных гандлёва-прамысловых прадпрыемстваў, якія змогуць з дзелавымі візітамі часцей наведваць гэтыя рэгіёны і працаваць над тым, каб насыціць рынкі афрыканскіх краін высакаякаснай прадукцыяй, якую выпускае наша айчынная прамысловасць».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

# БРЭНД «ЗРОБЛЕНА Ў БЕЛАРУСІ» Ў ТРЭНДЗЕ

## У студзені — жніўні экспарт тавараў і паслуг дасягнуў 32,8 мільярда долараў

Па выніках 8 месяцаў 2025 года экспарт тавараў і паслуг Беларусі склаў 32,8 мільярда долараў, перавысіўшы паказчык аналагічнага перыяду мінулага года на 300 мільёнаў долараў, паведамілі ў Мінэканомікі.

Асноўны ўклад забяспечылі паслугі — прырост амаль на 1 мільярд долараў, перш за ўсё за кошт транспартнага і будаўнічага сектараў.

Продажы тавараў на 2,5 % ніжэй за ўзровень мінулага года: скарачэнне за кошт паставак у натуральным выражэнні на фоне росту сярэдніх экспартных коштаў.

Беларусь працягвае ўмацоўваць пазіцыі на рынках краін «далёкай дугі». Прадукцыя пад брэндам «Зроблена ў Беларусі» ўсё больш актыўна заваёўвае давер спажыўцоў у Лацінскай Амерыцы, Афрыцы, Паўднёва-Усходняй і Цэнтральнай Азіі. Пастаўкі ў гэтыя рэгіёны дэманструюць упэўненую дынаміку: экспарт у Лацінскую Амерыку вырас у 1,5 раза, у краіны Азіі — у 1,3 раза. Афрыканскі кірунак захоўвае высокія тэмпы другі год запар.

Таксама адзначаецца паступовае запаволенне імпарту, што спрыяе паляпшэнню знешнегандлёвага балансу. За жнівень адмоўнае сальда скарацілася на 200 мільёнаў долараў.




# ААЭ — ПЕРСПЕКТЫЎНЫ РЫНАК ДЛЯ ЕАЭС

## Краіны «пяцёркі» разглядаюць Эміраты як хаб для гандлю ў рэгіёне

Адным з галоўных гандлёвых партнёраў ЕАЭС сярод краін Персідскага заліва з'яўляюцца Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, адзначылі ў Еўразійскай эканамічнай камісіі і нагадалі, што пагадненне аб эканамічным партнёрстве паміж Еўразійскім эканамічным саюзам і яго дзяржавамі-членамі з аднаго боку і ААЭ з другога боку было падпісана на палях пасяджэння Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета ў Мінску 27 чэрвеня гэтага года.

Дакумент не толькі мае на ўвазе шырокі ахоп тарыфнай лібералізацыі, але і стварае новыя, шмат у чым унікальныя прававыя ўмовы для развіцця ўзаемадзеяння.

Якія менавіта тавары закрануць прэферэнцыі, расказаў **дырэктар Дэпартамента гандлёвай палітыкі ЕЭК Уладзімір СЕРПІКАЎ:**

— Тарыфныя саступкі эмірацкай краіны пакрыюць 93 % нашага экспарту ў гэту краіну. Па аграпрамысловым комплексе дадзенае пагадненне мае на ўвазе альбо абнуленне тарыфных ставак, альбо тарыфныя скідкі, квоты на цэлы шэраг значных для нашага экспарту таварных пазіцый. Гэта малочная прадукцыя ў частцы АПК: сухое, цэльнае малако, сыры, кандытарскія вырабы, мёд, мінеральная вада — тое, што мы вырабляем у нашым Саюзе ў вялікіх колькасцях.

Адносна прамысловай групы спецыяліст растлумачыў, што гэта прадукцыя лесапрамысловага комплексу, металургічная прадукцыя, уключаючы гарачакатаны, халоднакатаны пракат, трубы, профілі, розныя віды абсталявання.

— То-бок гэта вельмі перспектыўны рынак, і самі Арабскія Эміраты мы разглядаем не проста як краіну-партнёра, а як хаб для нашага гандлю ў гэтым рэгіёне, — падкрэсліў Уладзімір Серпікаў.



# ПАСЛУГІ ЭНЕРГАСІСТЭМЫ З МАБІЛЬНАГА ТЭЛЕФОНА

Мінэнерга плануе да канца 2026 года запусціць адзіную лічбавую платформу. Як адзначыў **намеснік міністра энергетыкі Канстанцін АНОШАНКА**, платформа аб'яднае энергетычныя рэсурсы, усе паслугі і праекты, якія рэалізоўваюцца ў галіне.



Галоўная мэта яе стварэння — перавесці ў «лічбу» ўсе працэсы, у тым ліку заключэнне дагавораў на газа- і энергазабеспячэнне. Гэта дазволіць дзяржаве павысіць празрыстасць і кантроль усіх бізнес-працэсаў і ўвесці адзіны стандарт аказання паслуг.

У міністэрстве ўпэўнены, што спажыўцам гэта дазволіць знізіць рызыкі і палепшыць сэрвіс. Чалавек у адным пункце атрымае ўсе паслугі. Напрыклад, зможа з мабільнага тэлефона падаць заяўку на падключэнне да сістэмы газа- або энергазабеспячэння. Мінэнерга збіраецца захаваць цэнтры абслугоўвання, куды пры неабходнасці можна будзе прыйсці і з заявай на папяровым носьбіце.

Па словах **кіраўніка офіса лічбавізацыі Мінэнерга Уладзіслава ВАСІЛЬЕВА**, да канца гэтага года плануецца атрымаць лічбавы профіль усіх супрацоўнікаў. Цяпер да платформы ўжо падключаецца Дзяржнагляд, на працягу 3-4 месяцаў да яе далучацца ўсе прадпрыемствы галіны.

**Сяргей КУРКАЧ.**



# ЛІЧБА І БУДУЧЫНЯ

## ІТ-тэхналогіі павінны стымуляваць людзей думаць творча і нестандартна



Лічба стала ўсёпранікальнай. А ў апошнія год-два нават усёпаглынальнай. Адных гэта турбуе. Некаторыя нават асцерагаюцца, што штучны інтэлект канчаткова і беспаваротна захопіць планету, што будзе несці для чалавецтва вельмі сумныя наступствы. Іншыя сцвярджаюць: менавіта лічбавізацыя з'яўляецца чарговым безальтэрнатыўным вітком развіцця цывілізацыі. І хутка ўсё вакол будзе лічбавае. Як лічыць загадчык кафедры тэхналогій праграмавання Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь, доктар тэхнічных навук Аляксандр КУРБАЦКІ, ісціна ляжыць дзесьці пасярэдзіне. У лічбавых тэхналогіях утоена шмат магчымасцяў і рызык. І да новых ІТ-распрацовак мэтазгодна ставіцца не толькі і не столькі эмацыянальна, колькі прагматычна. Пра гэта навуковец казаў падчас прэзентацыі кнігі «Лічба і будучыня. 50 гісторый пра цывілізацыйны апакаліпсіс», якую ён напісаў у суаўтарстве з Міхаілам Зэкавым.

Штучны інтэлект, несумненна, — магутны інструмент. Але ён жыве мінулым: збірае, аналізуе і робіць высновы зыходзячы з папярэдніх досведаў. Іншае пытанне, што ён гэта робіць досыць хутка. Праўда, пакуль не заўсёды якасна. Аптымісты сцвярджаюць: электронны мозг будзе ўдасканальвацца, трэніравацца і высокія вяршыні інтэлектуальнай дзейнасці заваюе. Аднак ён усё роўна будзе завязаны на мінулым. Прынамсі, у тым фармаце, у якім цяпер працуюць генератыўныя моўныя мадэлі. Несумненна, па многіх параметрах чалавек ужо сёння не можа канкурыраваць з электронікай. Асабліва ў вырашэнні руцінных задач.

Уласна кажучы, існуе цалкам праўдападобная версія, што электронныя машыны і з'явіліся дзякуючы гэтым задачам. Ледзь не першыя камп'ютары распрацавалі па замове вайскоўцаў падчас Першай сусветнай вайны для складання табліц стрэльбаў, без якіх немагчыма дакладна весці агонь з любой артылерыйскай сістэмы. І пад кожную патрэбныя свае табліцы. Уручную на гэтую працаёмкую работу сыходзіла ледзь не гадоў дзесяць: усё вылічыць, пераправерыць... Таму ўкараненне ў войскі новых відаў узбраення была справай доўгай. Пераход на электронныя вылічэнні адразу спрасціў і паскорыў працэс. Уласна кажучы, з тых часоў мікрачыпы ўсё больш вызваляюць нас ад нудных задач. Але па-сапраўднаму творчыя матэрыі электроннаму мозгу пакуль не даступныя.

Штучны інтэлект пазбаўлены ўяўлення і інтуіцыі — гэтыя ўласцівасці чалавечага мозгу застаюцца па-за канкурэнцыяй. У самым пачатку мінулага стагоддзя, калі быць дакладным — у 1900 годзе, Анры Пуанкарэ сфармуляваў гіпотэзу, якая ўвайшла ў лік 7 матэматычных задач тысячагоддзя. Над яе рашэннем больш за стагоддзе біліся тысячы матэматыкаў. І толькі ў 2002—2003 гадах у серыі навуковых артыкулаў Рыгор Перэльман яе даказаў. А потым яшчэ некалькі гадоў яго доказ вывучалі з усіх бакоў і пераправаралі. Але адкуль дастаў сваю гіпотэзу Анры Пуанкарэ? Навукоўцы-фізіёлагі сцвярджаюць: проста здагадаўся. І такога навуковага прасвятлення штучны інтэлект пакуль пазбаўлены.








На думку Аляксандра Курбацкага, у лічбавую эпоху людзям давядзецца думаць па-новаму. Прынамсі, на яго думку, мэтазгодна планаваць будучыню на гарызонце хоць бы трох-пяці гадоў. Асабліва моладзі. Паводле яго слоў, нейрасеткі не з'яўляюцца прадуктам нашага дзесяцігоддзя. Наогул, іх канцэпцыя з'явілася яшчэ ў 50-х гадах мінулага стагоддзя. І штучны інтэлект з тых часоў перажыў некалькі хваляў папулярнасці, пасля якіх наступалі гады расчаравання. Аляксандр Курбацкі адзначыў: ён падтрымлівае рэгулярныя кантакты з паўсотняй сваіх вучняў. Яны працуюць і ў беларускіх, і ў замежных кампаніях і ўніверсітэтах. Ёсць свае людзі ў Google, Microsoft, Стэнфардскім, Масачусецкім універсітэтах... Яшчэ ў 2009 годзе з'явілася інфармацыя, па словах загадчыка кафедры тэхналогій праграмавання БДУ, што ў Google пачалі досыць актыўна выкарыстоўваць нейрасеткі ў цыкле вытворчасці праграмнага забеспячэння. І ўжо тады было відавочна: штучны інтэлект будзе паступова адбіраць працоўныя месцы ў праграмных супрацоўнікаў. І сапраўды: сёння рынак працы ў ІТ-сферы імкліва змяняецца ў бок адыходу ад паслуг спецыялістаў ніжняй кваліфікацыі.

Па перакананні прафесара БДУ, неабходна рэагаваць на хутка зменлівы тэхналагічны свет. І перш за ўсё — у сістэме адукацыі. Яна, на яго думку, павінна станавіцца больш гнуткай, каб паспяваць рэагаваць на змены навакольнага асяроддзя. І павінна арыентавацца не на класічныя фарматы перадачы інфармацыі і ведаў ад выкладчыка да студэнтаў, але, перш за ўсё, вучыць моладзь думаць, знаходзіць рашэнні нетрывіяльных задач. У гэтым асноўная перавага чалавечага мозгу над лічбавымі платформамі. Фармалізм у адукацыі на сёння нясе ў сабе вельмі шмат рызык. Дарэчы, той жа штучны інтэлект і іншыя ІТ-рашэнні найбольш канкурэнтаздольныя менавіта ў сістэмах, якія максімальна фармалізаваны і стандартызаваны. Электронны мозг, па вялікім рахунку, пазбаўлены свайго меркавання і эмацыянальнага фону. Таму будзе максімальна дакладна прытрымлівацца закладзенага алгарытму. І па гэтым параметры заўсёды будзе выйграваць у чалавека. У тым ліку і за выкладчыцкай кафедрай, а таксама за студэнцкай партай. І ўсё часцей даводзіцца чуць, як актыўна выкарыстоўваюць нейрасеткі вучні для напісання работ (нават дыпломных, а ўжо ёсць спробы і дысертацыі так ствараць), а выкладчыкі — для падрыхтоўкі лекцыйнага матэрыялу і праверкі работ сваіх вучняў. Таму, па перакананні Аляксандра Курбацкага, адукацыю новай эпохі неабходна рабіць больш творчай, гнуткай і свабоднай ад празмернай стандартызацыі. Тады ў нас будзе магчымасць паспяхова канкурыраваць з электроннымі платформамі. Дарэчы, ва ўльтрадарагіх школах на Захадзе для дзяцей мільярдэраў прыблізна па гэтым шляху і ідуць. І ў працэсе навучання па мінімуме выкарыстоўваюць лічбавыя рашэнні.



**Інтэлект ШТУЧНЫ**

PRO ЭКАНОМІКУ

# НАВУКОВА-ТЭХНАЛАГІЧНЫ РАЗРЫЎ

### У свеце ўсё менш краін маюць магчымасць валодаць фундаментальнымі навуковымі ведамі

Часам здаецца, што яшчэ ледзь-ледзь і чалавецтва зробіць канчатковы крок у светлую будучыню. На прадпрыемствах застануцца адны робаты, па палях будуць ездзіць беспілотныя сельскагаспадарчыя машыны, тавары да дзвярэй пачнуць дастаўляць дроны, а разумныя дамы разам з разумным транспартам і іншымі інтэлектуальнымі сістэмамі пазбавяць нас нават ад дробных бытавых клопатаў. Такую светлую будучыню малююць нам многія эксперты і публічныя спікеры. Праўда, нярэдка карані іх аптымізму хоць бы ўскосна грунтуюцца на прагнозах высокатэхналагічных кампаній. А такія карпарацыі павінны трансліраваць веру ў прагрэс па вызначэнні: інакш каціроўкі на біржы ўпадуць. У рэаліях цывілізацыя цяпер перажывае супярэчлівы перыяд, прычым вельмі неадназначны ў тэхналагічным разрэзе. Аб праблемах развіцця сучаснай навукі, яе значэнні ў развіцці грамадства, магчымасцях тэхналагічных прарываў і праблемах захавання канкурэнтаздольнасці краіны казалі на Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Сістэма «навука — тэхналогіі — інавацыі»: метадалогія, вопыт, перспектывы», арганізаванай Цэнтрам сістэмнага аналізу і стратэгічных даследаванняў Нацыянальнай акадэміі навук.

Навука заўсёды была дарагім ці вельмі дарагім кірункам. А сёння, калі казаць аб перадавых распрацоўках, яна становіцца недасягальнай калі не для большасці, то для вельмі многіх дзяржаў. Каб валодаць хоць бы прыкладной (не кажучы ўжо пра фундаментальную) навукова-даследчай базай, неабходныя каласальныя рэсурсы.

— Навука становіцца ўсё больш складанай і дарагой, — адзначыў **галоўны вучоны сакратар Нацыянальнай акадэміі навук Васіль ГУРСКІ.** — У выніку ўзмацняецца дыферэнцыяцыя дзяржаў па ўзроўні даследаванняў і інавацый.

З яго слоў, усё больш навуковы працэс залежыць ад наяўнасці аналітычнага абсталявання, прыборнай базы і наяўнасці ўнікальных сродкаў вымярэння, узроўню кваліфікацыі навукоўцаў. Словам, сучасная навука патрабуе каласальных чалавечых і тэхналагічных рэсурсаў. І імі валодаюць вельмі нешматлікія краіны. Фактар, які прыводзіць да тэхналагічнага разрыву паміж перадавымі і іншымі дзяржавамі, што, на думку Васіля Гурскага, паступова набывае непераадольны характар.

**Генеральны дырэктар ДНВА «Оптыка, оптаэлектроніка і лазерная тэхніка»** (уваходзіць у структуру Нацыянальнай акадэміі навук) **Максім БАГДАНОВІЧ** прывёў канкрэтны прыклад: традыцыйныя крамянёвыя тэхналогіі вытворчасці паўправаднікоў, фактычна, ужо ўперліся ў столь, абумоўлены фізічнымі абмежаваннямі. Апошнія некалькі дзесяцігоддзяў ідуць актыўныя пошукі матэрыялаў — заменнікаў з больш высокімі тэхнічнымі характарыстыкамі. Выдатна сябе зарэкамендаваў нітрыд галію — матэрыял, які дазваляе ствараць шырокі спектр электронных прыбораў з новымі характарыстыкамі, недаступнымі ў крамянёвым выкананні. Гэтыя тэхналогіі вельмі перспектыўныя для мікраэлектронікі, але яны адсутнічаюць у адкрытым доступе: не прадаюцца, а тым больш — не перадаюцца бязвыплатна.

— Яны лічацца крытычнымі для абараназдольнасці і эканамічнай незалежнасці любой краіны, — адзначыў Максім Багдановіч. — Нашы навукоўцы навучыліся працаваць з гэтым матэрыялам. Ёсць цэлае сямейства высокатэхналагічных распрацовак. Яны ўкараняюцца на профільных беларускіх прадпрыемствах. І гэта з'яўляецца адным з фактараў павышэння канкурэнтаздольнасці беларускай мікраэлектронікі.

Яшчэ адзін сусветны трэнд — павышэнне патрабаванняў да аддачы ад навукі. Яна стала не толькі сферай атрымання новых ведаў, але, фактычна, фабрыкай тэхналогій. На думку Васіля Гурскага, ёсць спробы і імкненні ва ўсім свеце навуковыя адкрыцці паставіць на паток, падпарадкаваць прынцыпам планавання, уласцівым вытворчым прадпрыемствам. У нейкай ступені ў навукова-даследчай дзейнасці, у сілу яе дарагоўлі, пачынае пераважаць эканамічны, камерцыйны складнік. Гэта абумоўлена змешаным фінансаваннем навуковых даследаванняў у многіх краінах. Выкарыстоўваюцца не толькі бюджэтныя грошы, але таксама сродкі бізнесу і нават прыцягненне капіталу на адкрытым рынку, па аналогіі з акцыянернымі кампаніямі. Натуральна, інвестары хочуць забяспечыць высокую і хуткую акупнасць сваіх укладанняў. Таму, адзначыў Васіль Гурскі, цяпер назіраецца дысбаланс паміж фундаментальнымі і прыкладнымі даследаваннямі ў бок апошніх, бо іх можна больш хутка камерцыялізаваць і атрымаць фінансава-эканамічны вынік.

А вось да фундаментальнай навукі цікавасць падае. Тэарэтычныя даследаванні дазваляюць зразумець сутнасць рэчаў, даць штуршок да адкрыццяў, якія могуць перавярнуць свет. Але адбудзецца гэта не заўтра, і нават не ў гэтым дзесяцігоддзі. Фундаментальная навука — гэта не толькі дарага, але і вельмі доўга з пункту гледжання атрымання канкрэтнага выніку. Нярэдка праходзіць некалькі дзясяткаў гадоў, перш чым тэарэтычныя адкрыцці атрымоўваецца рэалізаваць у практычнай плоскасці.

Таму, як адзначыў **акадэмік-сакратар аддзялення хіміі і навук аб зямлі Нацыянальнай акадэміі навук Аляксей ТРУХАНАЎ**, у апошнія 10—15 гадоў назіраецца сусветны трэнд на зніжэнні актыўнасці ў фундаментальнай навуцы. І гэта ўжо пачынае адбівацца на інавацыйным асяроддзі.

— Без тэарэтычнага падсілкоўвання выраджаюцца прыкладныя даследаванні, — адзначыў ён.

Несумненна, лічбавыя тэхналогіі імкліва крочаць па планеце. І робяць пэўныя поспехі. Але ў нейкай ступені гэта тлумачыцца павышанымі інвестыцыямі ў лічбавы сектар апошнія некалькі дзесяцігоддзяў. Па банальнай камерцыйнай прычыне: гэтыя ўкладанні прыносілі найбольш хуткую аддачу, прынамсі, яшчэ нядаўна. У цэлым цяпер высокатэхналагічныя кампаніі значна пераацэнены. А інавацыйны пасыл у іх выдыхаецца: зноў жа, з-за вычэрпвання фундаментальнага багажу. І той жа штучны інтэлект пакуль больш карысці прыносіць сваім распрацоўшчыкам і сумежным кампаніям, чым іншым галінам. Прынамсі, магчымасці ШІ вельмі моцна пераацэнены — мабыць, зрабіў справу масіраваны піяр. У той жа медыцыне пры распрацоўцы новых рэчываў нейрасеткі робяць цуды, але толькі калі гэта датычыцца малекул, якія добра даследаваны. З інавацыйнымі матэрыяламі, як адзначыў **дырэктар інстытута стратэгічных даследаванняў Рэспублікі Башкартастан Уладзімір САВІЧАЎ**, у электроннага мозгу ўзнікаюць праблемы. Пэўныя вынікі ён выдае, але працэнт памылак непрымальна высокі. І множацца правалы новых лекавых прэпаратаў, распрацаваных з шырокім выкарыстаннем штучнага інтэлекту. Прычым, па словах Уладзіміра Савічава, 70—80 % няўдач адбываюцца пры клінічных выпрабаваннях прэпаратаў на людзях, а не на жывёлах. Зноў жа, адбіваецца спецыфіка разумовай дзейнасці штучнага інтэлекту.

Як ні парадаксальна, але свет сёння перажывае адначасова два працэсы. З аднаго боку, трансфармацыі ў сілу вельмі бурнага развіцця IT-сектара. З іншага — крызіс новых ідэй па шырокім спектры кірункаў. І ў найбліжэйшы час ім няма адкуль узяцца: прынцыпова новыя кірункі дае фундаментальная навука. Гэта сфера ведаў сёння знаходзіцца не на вышыні, таму абвастраецца канкурэнцыя і міжрэгіянальная, і краінавая, якая выліваецца як у ваенна-палітычнае, так і эканамічнае супрацьстаянне — пошліны, санкцыі, абмежаванні, зніжэнне ўзроўню супрацоўніцтва. Па словах Васіля Гурскага, узмацняецца і барацьба за інтэлектуальныя рэсурсы. Перш за ўсё — носьбітаў высокіх ведаў. Перавабліванне навукоўцаў на сваю тэрыторыю адбываецца з выкарыстаннем самага разнастайнага інструментарыю: ад фінансавага да шантажу і маніпуляцый. Трэнд, які таксама не можа не ўплываць на сферу даследаванняў. Прынцыповым сёння з'яўляецца пытанне, як яе захаваць, бо навука як сфера фарміравання новых ведаў з'яўляецца падмуркам для інтэлектуальнага развіцця краіны, а адпаведна, і яе эканамічнай устойлівасці.

**Аляксей КЛІМАЎ.**














## СТАТУС МАЕ ЗНАЧЭННЕ

### Што змяняецца з 1 студзеня 2026 года ў рабоце ІП на маркетплэйсах, расказалі ў Мінэканоміцы




У профільным міністэрстве растлумачылі, што ў адпаведнасці з заканадаўствам фізічныя асобы, зарэгістраваныя ў якасці індывідуальных прадпрымальнікаў да 1 кастрычніка 2024 года, маюць права да 31 снежня 2025-га ажыццяўляць віды дзейнасці, не ўключаныя ў пералік, вызначаныя пастановай Савета Міністраў.

— Забароны ажыццяўлення індывідуальнымі прадпрымальнікамі дзейнасці на маркетплэйсах заканадаўства не ўтрымлівае, — падкрэслілі ў эканамічным ведамстве.

У выпадку рэалізацыі ІП тавараў з дапамогай інтэрнэт-пляцовак узнікаюць наступныя адносіны:

- продаж уладальніку інтэрнэт-пляцоўкі тавараў ІП, што не з'яўляецца вытворцам гэтых тавараў, для такога прадаўца будзе з'яўляцца аптовым гандлем. І гэты від дзейнасці не ўключаны ў пералік дазволеных для ІП;
- рэалізацыя тавараў уладальніку інтэрнэт-пляцоўкі, якая ажыццяўляецца ІП, што з'яўляецца вытворцам гэтых тавараў, для такога прадаўца не будзе з'яўляцца гандлем (тут мае месца дагавор пастаўкі) і можа ажыццяўляцца ў статусе ІП;
- рэалізацыя ІП тавараў канчатковаму спажыўцу — фізічнай асобе для асабістага, сямейнага, хатняга і іншага падобнага выкарыстання, не звязанага з прадпрымальніцкай дзейнасцю, будзе з'яўляцца рознічным гандлем (па форме «дыстанцыйны гандаль») і таксама можа ажыццяўляцца ў статусе ІП.

— Такім чынам, правамернасць ажыццяўлення дзейнасці з дапамогай інтэрнэт-пляцоўкі будзе залежаць ад мадэлі работы, што індывідуальны прадпрымальнік выкарыстоўвае, — заключылі ў Мінэканоміцы.

Тут таксама звярнулі ўвагу, што адпаведным законам ІП дадзена магчымасць стварэння камерцыйнай арганізацыі, якая заснoўваецца адной асобай у спецыяльным парадку без прыпынення дзейнасці і з пераходам усіх правоў і абавязкаў да створанай такім індывідуальным прадпрымальнікам арганізацыі.

— Для камерцыйных арганізацый, створаных індывідуальнымі прадпрымальнікамі ў адпаведнасці з законам, рэалізавана магчымасць працягнуць работу на маркетплэйсе з захаваннем гісторыі і напрацаванай дзелавой рэпутацыі (рэйтынгу), — запэўнілі ў эканамічным ведамстве.

Дарэчы, як расказала ў «Актуальным інтэрв'ю» «Першаму інфармацыйнаму» **дырэктар Дэпартамента па прадпрымальніцтве Вольга РУСІНОВІЧ**, каля паловы ІП ужо перарэгістравалася ў юрыдычныя асобы альбо вызначыла для сябе іншы дазволены від дзейнасці.

Спецыяліст падкрэсліла, што перарэгістрацыя працягваецца, і да 1 студзеня 2026 года яшчэ ёсць час прыняць рашэнне:

— Сама працэдура праходзіць «дзень у дзень». Каб скарыстацца гэтай магчымасцю, дастаткова сабраць просты пакет дакументаў і звярнуцца ў рэгістрацыйны орган.

# ТАЛЕНТЫ НЕ ЗАСТАЮЦЦА БЕЗ УВАГІ

## У Палацы Незалежнасці адкрылася выстаўка работ маладых людзей з абмежаванымі магчымасцямі



У рэзідэнцыю Прэзідэнта 15 кастрычніка завіталі маладыя людзі з абмежаванымі магчымасцямі, якія займаюцца выяўленчым мастацтвам у аддзяленні сацыяльнай рэабілітацыі, абілітацыі інвалідаў Салігорскага раённага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Гэта дзяўчаты і юнакі, якія не толькі прысвячаюць сябе мастацтву, але і жыва адгукаюцца на розныя падзеі ў жыцці горада і школы, нягледзячы на асаблівасці ў развіцці.

Паколькі гэтай моладзі даволі складана рэалізоўваць свае таленты і здольнасці, яны маюць патрэбу ў дапамозе — так узнікла ідэя творчага праекта «Новыя гарызонты». Ён накіраваны на рашэнне праблемы сацыяльнай адаптацыі інвалідаў. Навучэнцы Салігорскай дзіцячай мастацкай школы наведваюць сваіх равеснікаў у Цэнтры дзённага знаходжання, спрабуюць сябе ў якасці педагогаў, дзеляцца з імі набытымі ведамі. У працэсе навучання маладыя людзі з абмежаванымі магчымасцямі ўдзельнічаюць у разнастайных выстаўках, адну з якіх змаглі арганізаваць у Палацы Незалежнасці. І гэта рэальнае сведчанне таго, што галоўная афіцыйная пляцоўка краіны адкрытая для кожнага беларуса, тут заўсёды рады вітаць работы таленавітых суайчыннікаў, і для іх абавязкова знаходзіцца сваё месца.

**Намеснік дырэктара Салігорскага раённага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ірына МАКАРАВА** адзначыла, што магчымасць прадставіць творчасць моладзі з асаблівасцямі ў рэзідэнцыі Прэзідэнта — нечаканы падарунак. «Мы прывезлі сюды работы, выкананыя акрылавымі фарбамі, — падзялілася жанчына. — Напісанне карцін — своеасаблівая арт-тэрапія, якая спрыяе творчай самарэалізацыі. Яна дапамагае раскрыццю патэнцыялу, мастацкага густу, фантазіі і вынаходлівасці маладых людзей з абмежаванымі магчымасцямі. У сілу сваіх асаблівасцяў гэтым людзям часам складана ўтрымаць пэндзаль, падабраць колер, намаляваць задуманае...»

Для гэтага побач з імі заўсёды знаходзяцца дасведчаныя педагогі-валанцёры з Салігорскай дзіцячай школы мастацтваў. Вось ужо на працягу шасці гадоў **Вольга БОЛБАС** далучае моладзь да выяўленчага мастацтва. На думку жанчыны, дзеці — дар Божы, а дапамога асаблівым дзяўчынкам і хлопчыкам грэе душу: «Яны дораць нам невераготную радасць, якую цяжка з нечым параўноўваць. У сілу некаторых праблем са здароўем дзеці не наведваюць мастацкую школу. Аднак у кожнага з іх ёсць магчымасць развівацца, праяўляць свае таленты і камунікаваць адно з адным».

**22-гадовы Арцём ШУЛЯКОЎСКІ** наведвае заняткі ў ТЦСАН на працягу пяці гадоў. «Люблю працаваць з лагоднымі валанцёрамі-мастакамі Марыяй Віктараўнай (Дзікун. — **Заўв. аўт.**) і Вольгай Сяргееўнай (Болбас. — **Заўв. аўт.**)», — адзначыў з усмешкай малады чалавек. Наш суразмоўца, аказваецца, не толькі выдатна малюе, але і цудоўна спявае. Малады чалавек нават браў удзел у Міжнародным фестывалі мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» і заняў адно з прызавых месцаў. А яшчэ Арцём уважліва сочыць за дзейнасцю Прэзідэнта Беларусі. Ён з цікавасцю падчас экскурсіі па Палацы Незалежнасці задаваў хвалюючыя пытанні, уступаў у дыскусію, дзяліўся ўражаннямі ад убачанага.

**Інструктар па працоўнай тэрапіі Салігорскага раённага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Таццяна ЖЫХАРЭВІЧ** вельмі ганарыцца, што работы асаблівых дзяўчат і хлопцаў з Салігорска прадставілі ў такім знакавым для беларусаў месцы. «Для нас гэта радасць, як і магчымасць наведаць разам з імі Палац Незалежнасці, — расказала яна. — Мы бачым, што моладзь засталася пад вялікім уражаннем. Магчыма, гэтыя эмоцыі падштурхнуць да творчых парываў і знойдуць адлюстраванне ў новых работах».

Салігарчане прыехалі на экскурсію ў Палац Незалежнасці не з пустымі рукамі, у падарунак Прэзідэнту была перададзена карціна пад назвай «Дарога да храма». У сваю чаргу па даручэнні кіраўніка дзяржавы Салігорскаму раённаму тэрытарыяльнаму цэнтру сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва таксама ўручылі каштоўныя падарункі, якія паспрыяюць развіццю яго дзейнасці ў далейшым.

Аднак гэта яшчэ не ўсё. Міжнароднае грамадскае аб'яднанне «Хрысціянскі адукацыйны цэнтр імя святых Мяфодзія і Кірыла» сумесна з прыходам Беларускай праваслаўнай царквы ў гонар велікамучаніка Георгія Перамаганосца ў Мінску на галоўнай афіцыйнай пляцоўцы краіны паказалі гасцям батлеечны спектакль «Казка аб гасціннасці». Затым моладзі, іх бацькам і педагогам правялі экскурсію па самых вядомых залах рэзідэнцыі Прэзідэнта. Фінальным акордам паездкі ў Мінск для гасцей з Салігорска стала наведванне рэстарана хуткага абслугоўвання «Mak.by», дзе дзяўчаты і хлопцы пачаставаліся смачным абедам і атрымалі сувеніры.

**Яна ВАЛАСАЧ,**
**фота аўтара і БелТА.**





### Даслоўна



**Прэс-сакратар Прэзідэнта Беларусі Наталля ЭЙСМАНТ** адзначыла, што ў Палацы Незалежнасці ёсць шмат месца для творчасці. «Некалькі месяцаў таму мы папрасілі калег з Беларускага саюза мастакоў прынесці некалькі прапаноў — атрымалі каля пяці экспазіцый. Там былі прадстаўлены вельмі добрыя, глыбокія, прафесійныя работы, сярод якіх апошнімі сталі зусім адрозныя, ні на што не падобныя творы. Калі мы даведаліся, хто і як малюе гэтыя работы, не заставалася сумненняў, што мы павінны прадставіць іх тут (у Палацы Незалежнасці. — **Заўв. аўт.**). Гэтыя кранальныя творы заклікаюць паказаць усім, хто знаходзіцца ў цяжкай сітуацыі, што ўсё магчыма».


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ

Организатор торгов: **ООО «ТрастАудитКонсалт»** (УНП 692017051), 222304, Минская обл., г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 2В, пом. 14, тел. (8029) 777-91-61.
Публичные торги в форме аукциона в процедуре ликвидации будут проведены **17.11.2025 г. в 16.00** по адресу: г. Минск, ул. Максима Богдановича, д. 70, пом. 1Н

**Продавец: ООО «МилкПрофТрейдинг» (УНП 191764709) (Продавец является плательщиком НДС)**

| № лота | Наименование предмета торгов | Начальная цена с учетом НДС (20 %), BYN |
|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798802540, площадь – 14,6 кв. м, Административное помещение, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Ратомская, 50-112, с комплектом мебели согласно Спецификации 1 | 63840,00 |
| 2 | Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798802541, площадь – 10,6 кв. м, Административное помещение, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Ратомская, 50-113, с комплектом мебели согласно Спецификации 2 | 48480,00 |
| 3 | Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798802542, площадь – 106,2 кв. м, Административно-торговое помещение, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Ратомская, 50-114, с комплектом мебели согласно Спецификации 3 | 499 000,00 |
| 4 | Изолированное помещение с инвентарным номером 700/D-7374, площадь – 1139,40 кв. м, наименование – Встроенное помещение, назначение – вспомогательное (подсобное) помещение, не относящееся к жилищному фонду, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Пионерская, 37-65, в капитальном строении с инвентарным номером 700/С-1484 | 903 600,00 |
| 5 | Автомобиль Hyundai Accent 1.6 GT AT Comfort (седан), G270, белый акрил, 2014 год, б/у | 18269,00 |
| 6 | Автомобиль KIA RIO 4SDN 1.6i 6AT LX, коричневый металлик, 2014 год, б/у | 17147,00 |
| 7 | Автомобиль MERCEDES-BENZ SPRINTER 213CDI, 2008 год, б/у | 24330,00 |
| 8 | Автомобиль Toyota CAMRY, темно-серо-синий, 2019 год, б/у | 55627,00 |
| 9 | Автомобиль Toyota Land Cruiser 200, черный, 2009 год, б/у | 67939,00 |
| 10 | Автомобиль Мерседес-Бенц GLE 350 d 4MATIC Coupe, 2017 год, б/у | 113 767,00 |
| 11 | Компьютерная техника б/у согласно Спецификации 4 | 4630,00 |
| 12 | Комплект оборудования для кузовного ремонта автотранспорта б/у согласно Спецификации 5 | 100 180,00 |
| 13 | Бытовая техника б/у согласно Спецификации 6 | 1160,00 |
| 14 | 1) Капитальное строение с инвентарным номером 611/С-39051, общей площадью 433,5 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Березинский р-н, Березинский с/с, 3/1; 2) Капитальное строение с инвентарным номером 611/С-23771, общей площадью 549,4 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Березинский р-н, Березинский с/с, 3; 3) Линия по изготовлению топливных гранул и топливных брикетов из древесины хвойных и лиственных пород; 4) Линия деревообработки для производства деревянных блоков согласно Спецификации 7 | 3 013 344,00 |
| 15 | Офисная техника для печати б/у согласно Спецификации 8 | 3528,00 |
| 16 | Погрузчик дизельный TCM/арт FHD15T3Z, б/у | 18700,00 |
| 17 | Рефконтейнер 40 футов 12,2*2,44 69 NT 40 511 (2), б/у | 14600,00 |
| 18 | Рефконтейнер 20" 2004 г. в., б/у | 12900,00 |
| 19 | Рефконтейнер 40-футов, 2003 г. в, б/у | 14600,00 |
| 20 | Рефконтейнер 40" 2002 г. в., б/у | 14600,00 |
| 21 | Штабелер электрический Crown WF 3000, б/у | 3800,00 |

Телефон для ознакомления и осмотра +37529 7779161.

Дополнительные сведения об имуществе, спецификациях и порядке проведения аукциона опубликованы: https://cloud.mail.ru/public/wK9P/cUCkBJhVE

**Для участия в торгах необходимо в срок до 17.00 14.11.2025**

1) зарегистрироваться и подать заявление на участие в публичных торгах по выбранному лоту и соглашение о задатке по электронной почте info@truster.by либо по адресу: 222304, г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 2В, пом. 14;

2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY88 UNBS 3012 2173 7000 0000 0933 в ЗАО «БСБ Банк», BIC: UNBSBY2X, получатель – ООО «ТрастАудитКонсалт», УНП 692017051.

Шаг торгов – 5 %, задаток – 3 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов.

Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в размере 3 % от начальной цены предмета торгов в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 10 календарных дней со дня проведения торгов, но не ранее возмещения затрат, связанных с организацией и проведением торгов. Срок оплаты предмета торгов: не позднее 30 рабочих дней со дня проведения торгов.

Банк РРБ
на твоей скорости

**Закрытое акционерное общество «Банк роста и развития бизнеса»**
220034, г. Минск, ул. Краснозвездная, 18
**www.rrb.by**

Форма 1

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС**
30 сентября 2025 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 30.09.2025 | 31.12.2024 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 72 822 | 76 756 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 97 934 | 69 120 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 68 946 | 72 761 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 46 147 | 51 315 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 252 713 | 229 043 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 43 100 | 39 344 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 493 | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 18 258 | 13 410 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 9 607 | 10 709 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 610 020 | 562 458 |
| 16 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 22 631 | 33 190 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 518 201 | 451 493 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 1 025 | 10 254 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 2 785 | 3 800 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 544 642 | 498 737 |
| 25 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 20 429 | 20 429 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 10 053 | 10 053 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 20 542 | 21 165 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 14 354 | 12 074 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 65 378 | 63 721 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 610 020 | 562 458 |

Форма 2

**ОТЧЕТ о прибылях и убытках**
30 сентября 2025 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 30.09.2025 | 30.09.2024 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 29 264 | 19 678 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 24 968 | 14 077 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 4 296 | 5 601 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 9 071 | 8 614 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 2 103 | 1 710 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 6 968 | 6 904 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (174) | 20 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 18 959 | 13 704 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | (86) | 6 607 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 14 111 | 10 332 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 40 204 | 26 200 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 2 015 | 1 302 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 2 027 | 2 452 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 370 | 373 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 1 657 | 2 079 |

И.о. Председателя Правления В.В. Дранкевич

Главный бухгалтер Н.Н. Мостыко

Дата подписания: 9 октября 2025 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 21 выдана 25 апреля 2024 года Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100361187.


# ЦЁПЛАЕ ЖЫЛЛЁ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## ЭКАЛАГІЧНА І ПА ПРЫВАБНЫХ ЦЭНАХ

На выстаўцы шырока прадстаўлены перспектыўны кірунак — драўлянае домабудаванне. «Мы ўжо прадаём домакамплекты сотнямі і на гэтым не спыняемся, стараемся, для таго каб кожны беларус мог купіць экалагічна чыстае жыллё па прывабных цэнах, тым больш ёсць сур'ёзная падтрымка дзяржавы ў выглядзе крэдытавання на новых умовах па праграме «На родныя тавары», — падкрэсліў Аляксандр Кулік.



Міністр адзначыў, што драўляныя домакамплекты карыстаюцца вялікім попытам у беларусаў. Стаўленне насельніцтва змяняецца: спачатку людзі заказвалі дамы з сырога цыліндравага бруса, таму што яны былі значна таннейшыя, чым з сухога. «Цяпер дасведчаныя пакупнікі ўсё больш выбіраюць менавіта яго, паколькі хаты з сырога бруса патрабуюць часу для ўсаджвання і сушкі, а з сухога — можна засяляцца амаль адразу праз месяц», — расказаў Аляксандр Кулік. Паводле яго слоў, сёлета за студзень — верасень прададзена каля 200 камплектаў дамоў і лазняў, што значна больш, чым у 2023 годзе, калі прадалі ўсяго 10 за цэлы год. «Мы павялічваем магутнасці па выпуску такой прадукцыі. Людзі пачынаюць разумець, што драўляны дом — гэта экалагічна і камфортна для жыцця», — падкрэсліў міністр.

На выстаўцы наведвальнікаў сустракае экспазіцыя сучаснай лесанарыхтоўчай і дрэваапрацоўчай тэхнікі, якая ўражвае сваім магутным дызайнам і тэхнічнымі магчымасцямі. На вуліцы разгарнулася дэманстрацыя абсталявання, якое паказвае ўсе этапы апрацоўкі драўніны — ад спілу да канчатковага прадукту. Побач размяшчаецца ўтульны драўляны дом, па-майстэрску абстаўлены стыльнай і функцыянальнай мэбляй з натуральнага дрэва.

Аматараў натуральных прадуктаў прыцягваюць павільёны «Лясны домік», дзе прадстаўлены кірмаш. Тут можна пазнаёміцца з багаццем мясцовых смакаў і водараў — ад салодкага мёду да свежых лясных ягад і духмяных грыбоў, сабраных у экалагічна чыстых месцах.

## ШТУРШОК ДА РАЗВІЦЦЯ

Аляксандр Кулік адзначыў, што на выстаўцы паказана, як за гэтыя гады развілася лясная гаспадарка і што было дасягнута: «Мы раскажам аб насенні, вырошчванні пасадачнага матэрыялу, лічбавых тэхналогіях, ахове, узнаўленні лясоў, лесаўпарадкаванні, будаўніцтве дамоў, якімі таксама нельга грэбаваць у лясной гаспадарцы. Мы пагаворым аб машынах і механізмах, якія ёсць сёння ў лясной гаспадарцы. Яны на 90 % беларускай вытворчасці».



ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# КАРТКАЙ І ПА QR-КОДУ

## З лістапада ў маршрутках павінны выкарыстоўвацца плацежныя тэрміналы

Да апошняга часу выкарыстанне наяўных грашовых адзінак было паўсюдным на харчовых рынках і кірмашах, а таксама пры аплаце праезду ў маршрутках. На стацыянарных рынках гарадоў пастаянных прадаўцоў папрасілі перайсці на безнал, што яны, у асноўнай масе, і зрабілі. З маршруткамі аказалася складаней.

Як паведамілі ў Міністэрстве па падатках і зборах, у сувязі са зваротамі пасажыраў, з 1 лістапада для юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія ажыццяўляюць гарадскія аўтамабільныя перавозкі пасажыраў у рэгулярных зносінах аўтобусамі катэгорыі M2 (перавозкі ў маршрутных таксі), уводзіцца абавязак выкарыстоўваць плацежныя тэрміналы. Спецыялісты падатковага ведамства звяртаюць увагу на тое, што пастановай урада і Нацыянальнага банка яшчэ ў 2011 годзе былі прадугледжаны наступныя паняцці: картачны плацежны тэрмінал і плацежны тэрмінал.



**Картачны плацежны тэрмінал уяўляе сабой фізічную прыладу, якая дазваляе прымаць плацяжы выключна з выкарыстаннем банкаўскіх плацежных картак (БПК).**

Плацежны тэрмінал — больш шырокае паняцце, якое мае на ўвазе магчы-

# З ПАХАМ ЛЕСУ






У Беларусі ёсць поўны комплекс машын, падкрэсліў міністр. Тэхнічнае пераўзбраенне ў айчыннай лясной галіне пачалося з 2006 года.

> **«Налета будзе своеасаблівы юбілей — 20 гадоў з таго часу, як у 2006-м Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка правёў маштабную нараду ў Івацэвіцкім лясгасе і на «Івацэвічыдрэў». Менавіта з гэтага моманту вядзецца адлік развіцця айчыннага машынабудавання, дрэваапрацоўкі, усёй лясной гаспадаркі і лясной прамысловасці.**

Гэта нарада стала важным штуршком да развіцця галіны», — расказаў Аляксандр Кулік.

Кітайскія партнёры нядаўна ўпершыню прадставілі на беларускім рынку гусенічны харвестар, здольны працаваць у балоцістай мясцовасці. «Мы ўжо выпрабавалі яго ў Лагойскім лясгасе, — адзначыў міністр. — Першае ўражанне пра тэхніку вельмі добрае». Кіраўнік галіны падкрэсліў, што ўжо дадзены прапановы па яе дапрацоўцы, і ў найбліжэйшы час машына будзе ўнесена ў праграму закупак лесанарыхтоўчай тэхнікі.

У рамках выстаўкі таксама будуць прэзентаваныя экалагічныя сцежкі для дзяцей з дашкольных і школьных лясніцтваў. Гэта спецыяльныя групы, якія ствараюцца для адукацыі дзяцей, каб яны з юнага ўзросту бачылі, што гэта за праца і колькі ў яе ўкладваецца сіл і сродкаў, заўважыў Аляксандр Кулік.

Запланаваны некалькі тэматычных семінараў, прысвечаных працы тэхнікі і актуальным пытанням, у тым ліку звязаных з пелетамі. Асобнае мерапрыемства будзе прысвечана драўлянаму домабудаванню.

На стэндзе «Белдзяржпалявання» прадстаўлены трафеі жывёл і праекцыйны 3D-цір, дзе кожны зможа адчуць сябе паляўнічым. Можна таксама наведаць стэнды з узорамі асноўных лесаўтваральных парод для лесааднаўлення.

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**



ДОБРАЯ НАВІНА

# МАБІЛЬНАЯ СУВЯЗЬ ДАРАЖЭЦЬ НЕ БУДЗЕ

Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю падпісала чарговае пагадненне з беларускімі кампаніямі, якія прадастаўляюць паслугі сотавай сувязі. Як стала вядома, кампаніі А1 і МТС пакуль не будуць павышаць тарыфы на мабільную сувязь. Пагадненні з арганізацыямі дзейнічаюць да канца года.



